# Выхаванне дзяцей і падлеткаў у партызанскіх «лясных школах» у гады Вялікай Айчыннай вайны

***А.М. Пацыенка, С.А. Пацыенка,***
*выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

**Вялікая Айчынная вайна прынесла Беларусі вялізныя страты: загінула каля трох мільёнаў чалавек, ці кожны трэці жыхар рэспублікі. Сярод забітых было шмат дзяцей і падлеткаў. Многа гора выпала і на долю тых, хто застаўся ў жывых. Дзеці рана станавіліся дарослымі. Амаль ні ў каго не было бацькі, бо яны ваявалі ў Чырвонай Арміі ці ў партызанах; не было дзе жыць, не было чаго есці, не было чаго апрануць і абуць. Захопнікі вывозілі дзяцей у Германію ў якасці донараў крыві для параненых фашысцкіх салдат. Аблавы, расстрэлы, начныя бамбёжкі, смерць, страх, слёзы...**

У гады вайны нямецка-фашысцкія захопнікі закрылі ў Беларусі ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы, тэхнікумы і амаль усе школы. У 4-ай сярэдняй школе г. Гродна, сярэдняй школе г. Брагіна і многіх іншых размяшчаліся ўпраўленні жандармерыі. Сярэдняя школа ў раённым цэнтры Масты была ператворана ў канюшню. У адной з школ г. Баранавічы фашысты зрабілі казарму, а восенню, каб не хадзіць па гразі, увесь двор павысцілалі кнігамі школьнай бібліятэкі [1, с. 155]. Былі знішчаны 5177 і пашкоджаны 2648 школьных памяшканняў [2, с. 439], а таксама ўсё школьнае абсталяванне, інвентар, мэбля.

Знішчэнне сеткі адукацыйных устаноў на акупіраваных фашыстамі тэрыторыях цалкам адпавядала ўстаноўкам кіраўнікоў гітлераўскай Германіі. Яны лічылі, што «...для не немецкого населения восточных областей не должно быть высших школ. Для него достаточно наличия четырёхклассной народной школы. Целью обучения в этой народной школе должно быть только: простой счёт, самое большее до 500, умение расписаться, внушение, что божественная заповедь заключается в том, чтобы повиноваться немцам, быть честным, старательным и послушным...» [3, с. 24]. Уменне чытаць пры гэтым лічылася непатрэбным.

Імкнучыся паказаць «клопат» акупацыйных улад аб народнай адукацыі, атруціць свядомасць савецкіх дзяцей ядам фашысцкай ідэалогіі, гітлераўцы дазволілі адкрыць на тэрыторыі Беларусі невялікую колькасць школ. Захопнікі патрабавалі выхавання дзяцей у духу пакорнасці і поўнага падпарадкавання, пачуцця глыбокай павагі да гітлераўскага рэйха, нянавісці да ўсяго свайго, савецкага. У школах было ўведзена фашысцкае прывітанне, у класах вывешваліся партрэты Гітлера, вучням прысвойваліся парадкавыя нумары, да іх прымяняліся фізічныя пакаранні. Бацькі, якія не пускалі сваіх дзяцей у школы, караліся па законах ваеннага часу. Аднак захады гітлераўцаў наконт «народнай адукацыі» завяршыліся поўным крахам. Спасылаючыся на розныя цяжкасці, жыхары Беларусі не пускалі сваіх дзяцей у школы, што адкрываліся захопнікамі, а беларускія настаўнікі адмаўляліся ў іх працаваць.

За дапамогу партызанам фашысты знішчалі цэлыя вёскі, часта разам з жыхарамі. Уцалеўшыя беглі ратавацца да партызан. Часта тут хаваліся ад акупантаў і сем'і партызан. Для выратавання мірных жыхароў ад знішчэння захопнікамі ў многіх партызанскіх атрадах і злучэннях былі створаны лясныя грамадзянскія лагеры. У іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разам са старымі і жанчынамі знаходзілася шмат дзяцей. Не маючы магчымасці вучыцца ў школах, без пэўных заняткаў, прадастаўленыя самі сабе, дзеці станавіліся ахвярамі ўзарваўшыхся боезапасаў, якія спрабавалі выкарыстаць у якасці цацак. Партызаны, наколькі дазвалялі ваенныя абставіны, імкнуліся аблегчыць дзецям суровыя ўмовы жыцця. У многіх раёнах рэспублікі з восені 1942 года сталі адкрывацца савецкія, так называемыя лясныя, школы, у якіх дзеці, нягледзячы на ваенны час, працягвалі вучобу. Напрыклад, у Акцябрскім раёне Палескай вобласці ў 1942/1943 навучальным годзе былі адкрыты 8 школ [4, с. 71]. У 1943/1944 навучальным годзе толькі ў адным партызанскім атрадзе Макарэвіча брыгады імя Свярдлова (Брэсцкая вобласць) працавалі 4 школы [5, с. 314].

Вясной і восенню заняткі ў «лясных школах» праводзіліся пад адкрытым небам ці пад навесамі, дзе дзеці хаваліся ад дажджу. Калі было холадна, распальвалі кастры, каб адаграваць акачанелыя рукі. Зімой партызаны будавалі для школ памяшканні. Часта гэта былі буданы, зямлянкі, а іншы раз і спецыяльныя будынкі. Напрыклад, у зімовым лагеры партызанскага атрада імя Калініна (Брэсцкая вобласць) для школы пабудавалі дом памерам 10х6 метраў. У ім былі 3 вокны, зробленыя з дошак сталы і лаўкі для вучняў, класная дошка, печ з цэглы [6, с. 195]. Пазней школы сталі стварацца і ў населеных пунктах, якія знаходзіліся пад кантролем партызан.

Падпольныя камсамольскія арганізацыі, камандаванне партызанскіх атрадаў аказвалі школам усебаковую дапамогу. Яны забяспечвалі іх падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі, аховай, падбіралі настаўнікаў. Асабліва цяжка было здабываць падручнікі, алоўкі і паперу. Мясцовыя жыхары ахвотна перадавалі вучням школьныя матэрыялы, якія захаваліся з даваеннага часу, але іх было вельмі мала. Камсамольцы партызанскага атрада Мікалая Розава (Палеская вобласць) восенню 1942 года сабралі ў вёсках некалькі падручнікаў, больш за сотню алоўкаў і некалькі дзесяткаў вучнёўскіх сшыткаў [4, с. 71].

Вучоба ў «лясных школах» праходзіла ў суровых абставінах. Памяшканні былі мала прыстасаваны да заняткаў. Было холадна. Выкладалі ў іх партызаны, якія працавалі да вайны настаўнікамі. На заняткі яны прыходзілі з баявой зброяй. Вайсковыя падзеі знаходзілі адлюстраванне і ў вучэбным працэсе. Так,



**Партызан-настаўнік гутарыць з піянерамі атрада імя Сашы Васілеўскага (Палеская вобласць)**

у арыфметычных задачах давалася заданне вылічыць колькасць пушчаных пад адхон варожых эшалонаў ці знішчаных партызанамі гітлераўцаў. Калі над месцам размяшчэння школ з'яўляліся нямецкія самалёты, заняткі спыняліся і вучні хаваліся ў лесе. На больш значны час прыходзілася спыняць заняткі ў перыяд варожых блакад.

Настаўнікі школ прывівалі сваім выхаванцам любоў да Радзімы і нянавісць да нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Кожны дзень вучням зачытвалі зводкі Савінфармбюро, змест якіх яны перадавалі сваім бацькам. Сакратар Гарадоцкага райкама партыі Ф.Рыбакоў (Віцебская вобласць) прапанаваў вучням старшых класаў перапісваць тэксты лістовак і зводак Савінфармбюро. Дома запісы дзяцей чыталі дарослыя. Такім чынам змест лістовак хутка станавіўся вядомым значнай колькасці людзей [7, с. 253].

Школы ваеннага часу пакінулі ў былых вучняў вельмі добрыя ўспаміны. «Самае лепшае, што захавалася ў маёй памяці ад таго страш-

РЕПОЗИТОРИЙ

нага часу, – гэта наша школа, – успаміналa Алена Данілковіч, былая вучаніца школы пры партызанскім атрадзе імя Калініна. — Яна нават знешне прыцягвала да сябе. Вучоба ў партызанскай школе і піянерская работа абуджалі ўсе нашы мары і думкі аб Радзіме. Мы жылі жыццём усёй краіны» [4, с. 72].

Акрамя заняткаў, з дзецьмі праводзілася значная пазашкольная работа. Партызаны рабілі спартыўныя пляцоўкі, дапамагалі ствараць гурткі мастацкай творчасці, наладжвалі піянерскія ранішнікі, кастры.

У снежні 1942 года камсамольцы партызанскага атрада Розава і вёскі Загалле вырашылі арганізаваць для вучняў «лясной школы» навагоднюю ёлку. Камандаванне выдзеліла баяніста і пшанічнай мукі для навагодніх падарункаў. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы свята прынялі і мясцовыя жыхары. Яны падаравалі дзецям камплект даваенных ёлачных цацак, далі мёду і яблык. Камсамолкі напяклі смачнага пячэння.

На свята прыбылі прадстаўнікі штаба партызанскіх злучэнняў Мінскай вобласці, партызаны, дзеці і дарослыя вёскі Загалле і суседніх вёсак. На сходзе выступілі партызаны, настаўнікі, бацькі і вучні. Пасля ўрачыстай часткі адбыўся святочны канцэрт дзіцячай мастацкай самадзейнасці. Прыйшоў да дзяцей і Дзед Мароз, які павіншаваў іх са святам і ўручыў навагоднія падарункі [8, с. 318].

Добра была наладжана культурна-масавая работа з дзецьмі і ў партызанскім атрадзе імя Калініна (Брэсцкая вобласць). Камандзір атрада П. М. Кавальскі прапанаваў у сямейным лагеры стварыць для дзяцей піянерскі атрад. Піянерважатым быў прызначаны партызан Пётр Іваноўскі. Выбралі савет атрада, раздзялілі дзяцей па звёнах, склалі план работы. Пачалася падрыхтоўка да піянерскага кастра, на якім павінны былі ўручаць чырвоныя гальштукі. У сувязі з тым, што чырвонай тканіны ў партызан не было, жанчыны з сямейнага лагера зрабілі з прасцін і навалачак гальштукі і пафарбавалі іх настоем альховай кары.

Першы піянерскі касцёр адбыўся на лясной паляне. З сухога галля дзеці зрабілі вялікую пяціканцовую зорку, вакол яе расчысцілі пляцоўку для ўдзельнікаў. Каля кожнага канца зоркі паставілі вёдры з вадой, каб у выпадку нечаканага налёту фашысцкіх самалётаў можна было хутка патушыць вогнішча.

Каля кастра сабраліся бацькі і жыхары сямейнага лагера. Камандзір атрада П.М. Кавальскі і сакратар камсамольскай арганізацыі Сяргей Мядзведзеў павязалі піянерам чырвоныя гальштукі. Доўга працягвалася свята. Дзеці спявалі піянерскія песні, чыталі вершы



**Вучні і настаўнікі «лясной школы» на сустрэчы з сакратаром ЦК ЛКСМ(Б) К.Т.Мазуравым (Брэсцкая вобласць)**



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аб Радзіме, дэманстравалі сваё майстэрства ў гімнастыцы і танцах [4, с. 73].

У дзяцей партызанскай брыгады імя Суворава (Брэсцкая вобласць) выпускалася насценная газета. Значнае месца адводзілася спартыўна-масавай рабоце. Пад кіраўніцтвам Героя Савецкага Саюза лётчыка А. Кавалёва партызаны зрабілі для дзяцей спартыўную пляцоўку з перакладзінай, бумам, бегавой дарожкай, шастом і месцам для кідання гранат. Школьнікі вывучалі баявую зброю, здавалі нормы па супрацьпаветранай абароне, вучыліся аказваць першую медыцынскую дапамогу параненым.

У чэрвені 1944 года ў дзяцей адбылося свята, прысвечанае прыёму ў піянеры. Падрыхтоўка да яго пачалася яшчэ ў маі. Настаўніца Я. А. Чарняўская рэпетыравала з дзецьмі напісаную ёю п'есу «Юныя мсціўцы», а настаўніца В. Г. Іванова развучвала з імі вершы і песні. Камсамолкі штаба брыгады з парашутнага шоўку пашылі піянерскія гальштукі. Партызаны на лясной паляне зрабілі сцэну і лаўкі. На свята прыйшлі камандзіры і байцы партызанскай брыгады, жыхары сямейных лагераў і больш за трыста дзяцей. У піянеры прынялі 150 школьнікаў. Адбыўся вялікі канцэрт дзіцячай мастацкай самадзейнасці [5, с. 314; 9, с. 173].

Дзеці ваеннага часу з'яўляліся актыўнымі памочнікамі партызан і ўдзельнікамі многіх культурных мерапрыемстваў, якія праводзіліся на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Камандзір 8-ай партызанскай брыгады Герой Савецкага Саюза С.Г. Жунін успамінаў, як былі здзіўлены і абрадаваны дэлегаты нарады камандзіраў партызанскіх брыгад і атрадаў, якая праводзілася ў 1944 годзе Брэсцкім падпольным абласным камітэтам камсамола, калі было аб'яўлена, што іх прыйшлі вітаць піянеры. Тут, у лесе, сярод балот, дзе ішла жорсткая барацьба з акупантамі, было нязвыкла бачыць хлопчыкаў і дзяўчынак у піянерскай форме з чырвонымі гальштукамі. Гэты піянерскі салют запомніўся народным мсціўцам назаўсёды [4, с. 75].

Партызаны рэспублікі па меры магчымасці праяўлялі клопат аб дзецях ваеннай пары. Разам з навучаннем іх у «лясных школах» яны праводзілі і значную грамадскую работу: стваралі піянерскія арганізацыі, дзіцячыя калектывы мастацкай творчасці, адзначалі савецкія святы і г. д.

У выніку вялікай выхаваўчай работы ў глыбокім тыле ворага раслі сапраўдныя патрыёты. Ахопленыя ўсеагульным патрыятычным пачуццём, дзеці наведвалі заняткі ў школах, вывучалі вайсковую справу, часам хадзілі ў разведку, удзельнічалі ў дыверсіях, распаўсюджвалі падпольную літаратуру. Яны больш карысна праводзілі вольны час, рабіліся актыўнымі памочнікамі партызан: збіралі для народных мсціўцаў шчаўе, грыбы, ягады, лекавыя травы, даглядалі параненых, выступалі перад імі з канцэртамі.

Арганізацыя «лясных школ» сведчыць, што і ў суровыя дні вайны дарослыя клапаціліся аб сваёй маладой змене.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Будай, Г.* Свинцом и словом: записки журналиста / Г. Будай. – 2-е изд., доп. – Минск: Беларусь, 1981. – 223 с. с ил.

2. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. – Минск: Беларусь, 1965. – 464 с. с ил.

3. *Черник, С.А.* Советская общеобразовательная школа в годы Великой Отечественной войны / С.А. Черник. – М.: Педагогика, 1984. – 240 с.

4. *Пациенко, А.М.* Культурно-просветительная работа в партизанских краях и зонах Белоруссии в годы Великой Отечественной войны: дис. ... канд. пед. наук / А.М. Пациенко. – М., 1985. – 167 с.

5. Буг в огне: сб. воспоминаний. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск: Беларусь, 1970. – 464 с.

6. *Залескі, А. І.* Дарогамі партызанскай Беларусі / А.І. Залескі. – Мінск: Беларусь, 1974. – 256 с.

7. *Жилянин, Я.* Без линии фронта / Я. Жилянин, И. Позняков, В. Лузгин. – Минск: Беларусь, 1979. – 382 с. с ил.

8. *Денисевич, А.* Орлиное племя / А.Денисевич. – Минск: Беларусь, 1972. – 426 с.

9. *Ромма, Ф.Д.* Мужала молодость в боях / Ф.Д. Ромма. – Минск: Беларусь, 1974. – 312 с. с ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ